***А. І. Сцепанцоў,***
*кандыдат культуралогіі, дацэнт*

# ЯКАСЦЬ ЖЫЦЦЯ СЕЛЬСКІХ ГРАМАДЗЯН І МАГЧЫМАСЦІ ІХ КУЛЬТУРНАГА РАЗВІЦЦЯ

Сельская традыцыйная культура заўсёды арыентавана на гарманізацыю адносін з прыродай, на больш высокую экалагічную чысціню прасторы жыхарства. Сельская культура – гэта атрыманы ў сацыяльную спадчыну комплекс практыкі і вераванняў, які вызначае асновы жыццядзейнасці сельскай абшчыны (грамадства). Яе адрозненне ад гарадской культуры не столькі ў колькасных і якасных параметрах асноўных яе складнікаў, колькі ў тэхніка-арганізацыйных, прасторава-ча́савых і функцыянальных характарыстыках.

Дзяржаўная праграма адраджэння і развіцця вёскі на 2005–2010 гады [1] стала знакавай для нашай краіны. За мінулыя гады шматлікія мясціны Беларусі паступова набылі новыя рысы сучасных селішчаў: з’явіліся добраўпарадкаваныя пляцы, змянілася архітэктура забудовы. Ажыццяўляецца адказная задача захавання самабытнасці культурных традыцый беларускай вёскі: паданняў, звычаяў, асаблівасцей укладу жыцця, мастацтва народных музыкаў, танцораў, мясцовых умельцаў, рамеснікаў. Адначасова неабходна надаць кожнай сельскай установе культуры сучаснае аблічча, насыціць вольны час зместам, які адпавядае грамадскім запытам. Важнай уяўляецца задача прыцягнення моладзі ў актыўнае культурнае жыццё з ужываннем сучасных тэхналогій вольнага часу, што, несумнеўна, стане дадатковым стымулам у павышэнні якасці жыцця.

Развіццё сельскіх тэрыторый мае і палітычны падтэкст: моцная і дынамічная эканоміка вёскі – гэта аснова, гарантыя захавання насельніцтва сельскіх тэрыторый, іх гаспадарчага ўладкавання. Значнасць сельскай мясцовасці для грамадства расце па меры актуалізацыі аховы навакольнага асяроддзя і вытворчасці экалагічна бяспечнага харчавання. Агульнавядома, што ў свеце ўзрастае попыт на прадукты, вырабленыя ва ўмовах экстэнсіўнага вядзення гаспадаркі: лічыцца, што яно ў большай меры гарантуе параметры якасці і экалагічнай бяспекі. Страты ад нізкай прадукцыйнасці тут кампенсуюцца высокімі коштамі, а галоўная праблема – у стварэнні эфектыўных маркетынгавых і збытавых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

механізмаў. Рэспубліка Беларусь мае трывалую рэпутацыю пастаўшчыка экалагічна чыстага прадукту і можа з гэтым выйсці на сусветны харчовы рынак. Выкарыстоўваючы экалагічна бяспечныя як традыцыйныя, так і сучасныя аграрныя і іншыя тэхналогіі, беларускія сельскія вытворцы маюць досвед арганічнага ўпісвання ў мясцовыя экаарэалы і аптымальнага выкарыстання іх сельскагаспадарчых рэсурсаў, фарміравання высокапрадукцыйных і экалагічна ўстойлівых аграсістэм і аграландшафтаў. Ва ўмовах дэфіцыту сельскагаспадарчых угоддзяў у сусветным маштабе прадукцыйныя землі краіны забяспечаць у значнай меры эканамічную і экалагічную бяспеку насельніцтва.

Найважнае значэнне маюць і такія цесна злучаныя паміж сабой аспекты сельскага развіцця, як рэкрэацыйны і экалагічны. Сельскагаспадарчая праца з'яўляецца, асабліва для гараджан, разнавіднасцю актыўнага адпачынку і ўмацавання здароўя, бо тут маюць месца змена дзейнасці, зносіны з жывёльным светам і прыродай, фізічная праца на вольным паветры. На спалучэнні сельскагаспадарчай працы з актыўным адпачынкам у вясковых умовах грунтуецца разнавіднасць турыстычнага бізнесу – агратурызм, які хутка развіваецца ў свеце. У некаторых рэгіёнах Паўночнай Еўропы ў ім заняты да 60% працуючых у мясцовай эканоміцы.

Ідэя аграгарадкоў, якая атрымала ўвасабленне ў нашай краіне, упісваецца ў сусветныя працэсы рурбанізацыі[1]. Шматлікія заходнія даследчыкі адзначаюць, што свет уступіў у паласу сацыяльных змен, і падкрэсліваюць ролю сельскіх тэрыторый у пераадоленні крызісу. Адной з базавых характарыстак новай хвалі сацыяльнага развіцця лічыцца адраджэнне лакальнасці і мясцовых супольнасцей, аб'яднаных Інтэрнэтам, які дазволіць узаемадзейнічаць у сумесным стварэнні багацця праз інфармацыйны абмен, краўдсорсінг[2], сумесны дызайн і іншыя формы інавацыйнага ўзаемадзеяння. Мяркуецца стварэнне Сусветнай сеткі вёсак, якая зможа служыць каталізатарам стварэння гэтых сувязей. Адна з праблем сельскіх тэрыторый у індустрыяльную эпоху заключалася ў тым, што вёскі былі ізаляваны. Актыўнае маладое

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[1] Рурбанізацыя (ад фр. Rural – сельскі і лат. urbs – горад; англ. Rurbanization; ням. Rur-banisierung) – працэс распаўсюджвання гарадскіх форм і ўмоў жыцця на сельскую мясцовасць, частка ўрбанізацыі, якая можа суправаджацца міграцыяй гарадскога насельніцтва ў вёску.

[2] Краўдсорсінг (англ. crowdsourcing, crowd – натоўп і sourcing – выкарыстанне рэсурсаў) – перадача вызначаных вытворчых функцый нявызначанаму колу асоб без працоўнай дамовы ў разліку на жаданне спажыўцоў бясплатна ці за невялікі кошт падзяліцца сваімі ідэямі з кампаніяй, выключна з цікавасці ўбачыць іх увасобленымі ў вытворчасці.

насельніцтва выязджала ў гарады, але гэта больш не з’яўляецца непазбежнай сітуацыяй. У сучасным свеце ІТ-тэхналогій сельскія жыхары могуць быць часткай сусветнай культуры, працаваць з людзьмі з іншых краін, абменьваючыся досведам і дасягненнямі. У гэтым працэсе дзяржава будзе ўдзельнічаць, падтрымліваючы адмысловыя цэнтры, якія аказваюць садзейнічанне вяскоўцам. Пры такім падыходзе прадукцыйнасць працы ў сельскай мясцовасці значна вырасце. Зямля была адной з найважнейшых прылад развіцця на папярэдніх этапах, і варта чакаць, што і для будучых этапаў яна будзе мець велізарнае значэнне. Аграрная палітыка будзе абавязковым складнікам прывядзення сусветнай супольнасці на шлях дынамічнага росту і росквіту [2].

Уяўляецца, што дзяржаўная палітыка ўдасканалення агра-прамысловага комплексу Рэспублікі Беларусь рэальна ўпісваецца ў кантэкст сусветнага развіцця сельскіх тэрыторый: закладзены рэальныя эканамічныя магчымасці для комплекснага рашэння праблем сацыяльнага ўладкавання вёскі, павышэння ўзроўню жыцця сельскага насельніцтва. Усяго створана 1481 аграгарадок, у тым ліку: у Мінскай вобласці – 325; Віцебскай – 254; Гродзенскай – 239; Гомельскай – 238; Брэсцкай – 222; у Магілёўскай – 203 [3].

Кіраўніцтва краіны паслядоўна і мэтанакіравана трымае курс на развіццё сельскай гаспадаркі: Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 342 ад 1 жніўня 2011 г. зацверджана Дзяржаўная праграма ўстойлівага развіцця вёскі на 2011–2015 годы [4]. Прадугледжана, што павышэнне эфектыўнасці аграпрамысловага комплексу стане асновай для рашэння задач сацыяльнага характару на базе ўжо створаных аграгарадкоў, а таксама на развіццё зон іх уплыву – найблізкіх сёл (у частцы інжынерна-транспартных камунікацый і іншых сацыяльна значных аб’ектаў). Рэалізацыя дадзеных мерапрыемстваў будзе ажыццяўляцца ў рамках планаў развіцця кожнага аграгарадка (уключаючы зоны ўплыву). Такім чынам, найважнейшае значэнне набывае для аграгарадкоў удасканаленне сацыяльна-культурнай дзейнасці сельскіх устаноў культуры.

Відавочна, што са з’яўленнем новых сацыяльна-тэрытарыяльных адзінак (з іх асаблівасцю дэмаграфічнага складу) наяўныя тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці недастаткова забяспечваюць рэалізацыю рэгіянальнай культурнай палітыкі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

слаба арыентаваны на фарміраванне духоўна-маральнай культуры чалавека і яго здаровага ладу жыцця. Ва ўстановах культуры аграгарадкоў мае месца рэальнае адставанне арганізацыйна-метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці, адсутнічае іх мэтанакіраванае комплекснае навукова абгрунтаванае даследаванне. Гэта тычыцца пытанняў даступнасці для насельніцтва культурных прадуктаў і паслуг, якасці і зместу культурна-дасугавых праграм і сацыякультурных праектаў. У гэтых умовах узрастае запатрабаванне ў стварэнні інавацыйных механізмаў сацыякультурнай дзейнасці, у іх укараненні ў рэальную сацыякультурную прастору, а таксама ў распрацоўцы эфектыўных кіраўніцкіх падыходаў па інтэграцыі дзейнасці сацыякультурных устаноў аграгарадкоў, актывізацыі прыцягнення небюджетных сродкаў для стварэння культурных праектаў на ўмовах партнёрства.

Навуковы калектыў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў у рамках Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2011–2015 гады ажыццяўляе тэарэтычнае абгрунтаванне і распрацоўку інавацыйных тэхналогій сацыяльна-культурнай дзейнасці (культуратворчай, этнакультурнай, інфармацыйна-пазнавальнай, рэкрэацыйнай і анімацыйнай). Навуковую базу іх мэтанакіраванага стварэння складае даследаванне сацыяльна-культурнага развіцця сельскіх тэрыторый, культурных рэсурсаў і кірункаў сацыякультурнай дзейнасці аграгарадкоў, выяўленне тэндэнцый развіцця спажывецкай сферы, арыентацый на фарміраванне духоўна-маральнай культуры чалавека і яго здаровага ладу жыцця, арганізацыйных перадумоў забеспячэння рэалізацыі рэгіянальнай культурнай палітыкі і яе ўдасканалення. Навуковае даследаванне дазволіць:

– аптымальна забяспечыць адпаведнай інфармацыяй і тэхналогіямі працэсы захавання, стварэння, распаўсюджвання і засваення культурных каштоўнасцей, іх трансляцыю ад стваральніка да спажыўцоў культурных прадуктаў і паслуг ва ўмовах сельскага рэгіёна;

– унесці прапановы па рэгуляванні сацыяльна-эканамічных адносін на сельскім сегменце культурнага рынку з мэтай задавальнення культурных запатрабаванняў як асобы, так і сацыяльных супольнасцей у цэлым;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– распрацаваць тэхналагічныя падыходы па падтрымцы і карэктаванні культуратворчых, сацыятворчых і чалавекафарміруючых працэсаў на аснове заканадаўства Рэспублікі Беларусь;

– стварыць інфармацыйную базу дадзеных культурных рэсурсаў і кірункаў сацыякультурнай дзейнасці, сфарміраваную па тэрытарыяльна-аб’ектным прынцыпе;

– распрацаваць метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі, утрыманні і выкарыстанні тэхналогій сацыяльна-культурнай дзейнасці ў аграгарадках Рэспублікі Беларусь.


*1. Государственная* программа возрождения и развития села на 2005–2010 годы // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2005. – № 52. – С. 14–53.

*2. Общество* будущего. – URL: http://www.ecology.md/section.php.

*3. Сколько* агрогородков в Беларуси? – URL: http://www.region.grodno.by/ru/ analitika.

*4. Новости* Министерства сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь. – URL: http://mshp.minsk.by/print/news.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ